что первостепенное значение придается осуществлению точечных ударов с использованием спецподразделений и беспилотной авиации, более тщательному сбору разведсведений и укреплению ЦРУ, совершенствованию кибероперций, использованию «мягкой силы» (ввод санкций и наложение эмбарго), а также предоставлению скорее своих ресурсов и возможностей, чем отправке американских военнослужащих в горячие точки.

**Литература**

1. Резолюция 1973 (2011), принятая Советом Безопасности на его 6498-м заседании 17 марта 2011 г.: документ ООН S/RES/1973(2011) // Нью-Йорк: ООН, 2011. — 9 с.

2. Rubin, B. Is U.S. Foreign Policy Made In The USA? [Electronic resource]/ B. Rubin // Eurasia Review. — Mode of access : http://www.eurasiareview.com/02052011-is-u-s-foreign-policy-made-in-the-usa-analysis/. — Date of access : 07.04.2012.

3. Zimmerman, D. Senator McCain and Senator Obama on humanitarian intervention [Electronic resource] / D. Zimmerman // International Law Observer. — Mode of access : http://internationallawobserver.eu/2008/10/08/senator-mccain-and-senator-obama-on-humanitarian-intervention/. — Date of access : 28.03.2012.

4. Operation Odyssey Dawn (Libya) : Background and Issues for Congress [Electronic resource] // Federation of American Scientists. — Mode of access : http://www.fas.org/sgp/crs/natsec/R41725.pdf. — Date of access : 3.04.2012.

## Славянскія народныя ўяўленні пра курганы

*Васільчук А. А., студ. IV к. БрДУ ім. А. С. Пушкіна,*
*навук. кір. праф. Швед І. А., д-р філал. навук*

Адным з найбольш пашыраных элементаў ландшафтнага коду ў міфапаэтычнай карціне свету беларуса з’яўляецца курган. Народныя ўяўленні пра ўтварэнне курганоў вельмі разнастайныя. Але збольшага яны трактуюцца як насыпы над пахаваннямі загінуўшых падчас якой-небудзь. Прыкладам, у часы нашэсця хана Батыя, вайны з туркамі, шведамі, французамі і г. д. Паводле паданняў, у некаторых насыпах нібыта пахаваныя самі багі, асілкі, велікалюды або проста — жаўнеры, палякі, саксонскія ваякі, літоўцы і нават кітайцы і японцы [1, с. 214].

У народзе курганы маюць розныя назвы — Валатоўкі, Капцы, Татарскія магілы, Шведскія магілы, Французскія магілы. Сустракаюцца — Паганскія магілы, магілы жрацоў — крывейтаў, Дзявочыя магілы, Сінія горкі, Карагодзіца, Гуслішчы, Цымбалы і інш. У Дубровенскім раёне ёсць Змеевы магілы. Па паданні, некалі ў возеры жыў змей, які еў жывёл і людзей. Але з’явіўся

асілак і рассек змея на тры часткі. Над кожнай з іх насыпалі курган. Зямлю вазілі на вазках, запрэжаных пеўнямі. Часам адзін і той жа могільнік вядомы пад некалькімі дублетнымі назвамі (Капцы ці Валатоўкі) [2, с. 262].

Ва ўсіх без выключэння выпадках курганы ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў ідэнтыфікуюцца як аб'екты антрапагеннага паходжання і толькі як месцы пахаванняў. Па-другое, курганы ў народных міфалагічных уяўленнях практычна заўсёды суадносяцца з ідэяй не «свайго», але «чужога», «іншага», якое ў кожным асобна ўзятым выпадку можа мець сваё канкрэтнае напаўненне: эпахальна-міфалагічнае (волат, асілак — першыя легендарныя насельнікі краю, суаднесенныя з міфалагічнай эпохай першастварэння, якая супрацьпастаўлена «свайму», «нашаму» часу; змей-кравец — міфалагічны персанаж, агент іншасвету сярод людзей); этнакультурнае (французы, шведы, татары — прадстаўнікі «чужынцаў» у народнай карціне свету); сацыякультурнае (найменні кшталту «Баторыева гара», «Магіла Рагнеды» выводзяць на фальклярызаваныя вобразы валадароў). Разам з тым практычна ўсе фальклорныя сюжэты, прысвечаныя курганам, суадносяцца з выразна дэвіяцыйнай, крызіснай сітуацыяй (найчасцей вайна, але і пошасць, забойства) і, як вынік, гвалтоўнай смерцю: «Там капцы, у тых капцах людзі забітыя, гэта даўно было, бо вялікія дрэвы параслі на тых капцах. Гэтая акалічнасць падкрэслівае апазіцыйнасць курганных пахаванняў уласна вясковым могілкам, якія ў сімвалічным плане выступаюць як паселішча (вёска) нябожчыкаў, што памерлі «сваёй», «прыроднай» смерцю, выдаткаваўшы ўсю жыццёвую энергію. Паказальнай у дадзеным выпадку з'яўляецца абрадавая інверсія пры пахаванні самагубцаў ці чараўнікоў, якая сімвалічна замацоўвала за апошнімі статус «чужых» для дадзенай супольнасці. Так, яшчэ ў сярэдзіне 19 ст. у Беларусі існаваў звычай на месцы пахавання «загубка» насыпаць вялікі пагорак ці курган [2, с. 263].

Паколькі курганы лічыліся зачараванымі і недатыкальнымі месцамі, то за спробу парушыць святыню, паводле народных уяўленняў, чалавека чакала кара. Так, кажуць, што ў мястэчку Лукомль Чашніцкага раёна некалі спрабавалі араць на курганах. Дык пасля гэтага ці конь, на якім аралі, некуды знікаў, ці пачынаў невылечна хварэць сам араты. А ў вёсцы Вялікі лес на Міншчыне расказвалі, як аднаго разу нейкі селянін ссек на кургане высокую хвою і стаў будаваць там млын. Будоўлю ён так і не скончыў, бо неўзабаве памёр [1, с. 226].

Вельмі часта курганы выкарыстоўвалі і дзеля лекавання. Так, у вёсцы Буда Рагачоўскага раёна ў 19 ст. у курганным насыпе была пракапана шырокая траншэя, прз якую кожны год праганялі свойскіх жывёл дзеля засцярогі іх ад пошасці. Дарэчы, падобныя выпадкі зафіксаваны і на тэрыторыі паўднёвай Расіі. У земляным праходзе зазвычай запальвалі розныя гаручыя рэчывы і такім спосабам абкурвалі жывёлу [1, с. 227].

Лічылася, што ў пэўных курганах нібыта схаваны ўсялякія скарбы. Згодна з сюжэтамі такіх паданняў, ноччу на кургане, дзе закапаны скарб, з'яўляюцца агеньчыкі, на паверхню выходзіць, скажам, куфар з багаццем. Часам можа заспяваць певень ці людзі бачаць там салдат, якія ахоўваюць каштоўнасці. Так, на кургане каля вёскі Лятохі Віцебскага раёна нібыта з'яўляецца белы конь і скача паміж насыпамі. У Гарадоцкім раёне на адным з курганных могільнікаў можна ўбачыць двух аграмадных коней, а на другім — белую буду, запрэжаную тройкай белых коней. Белы колер тут невыпадковы. У міфалогіі ён выступае як сімвал смутку і смерці, пераходу ў іншы стан [1, с. 227].

Завяршаючы агляд славянскіх народных уяўленняў пра курганы трэба адзначыць, што семантыка курганоў шматаспектная і ў сваёй аснове надзвычай архаічная. У славянскіх народных вераваннях курганы надзяляюцца пазітыўнай семантыкай. Разам з тым яны звязваюцца міфалагічнай свядомасцю з іншасветам, вобласцю смерці, душамі памерлых, нярэдка самазабойцаў, а таксама надзяляюцца ўласцівасцю магічна ўздзейнічаць на лёсы жывых людзей і на прадметы, якія знаходзяцца на зямлі.

**Літаратура**

1. Дучыц, Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Л. Дучыц, І. Клімковіч. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. — 384 с.

2. Лобач, У. Курган / Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мінск : Беларусь, 2011. — С. 262–265.

## Мебель на территории Беларуси накануне войны 1812 г. в произведении А. Мицкевича «Пан Тадеуш»

*Волкова Д. О., студ. IV к. БГУ,*
*науч. рук. ст. преп. Кушнир А. И.*

В XIX веке территории современной Беларуси в своем большинстве вошли уже в состав Российской империи. Такое некогда могущественное государство, как Речь Посполитая, после 1795 г. перестало существовать. Многие тосковали по утраченной самостоятельности своей страны. Именно поэтому, когда на Россию двинулся Наполеон и пообещал восстановить независимость Речи Посполитой, эта надежда питала многих белорусов, ставших под французские знамена. С другой стороны, некоторые белорусы остались верны царю Александру I. Он также обещал даровать самостоятельность белорусско-литовскому краю, но слова до дела не довел. Белорусы воевали с белорусами как по принуждению, так и сознательно, фактически с одной и той же целью — восстановить государство [1].